**Тарасава С.М. (Гродна, Беларусь)**

## Матыў загубленага дзяцінства ў паэмах беларускіх пісьменнікаў пра Чарнобыль

Можна ўпэўнена сцвярджаць, што ўвага да тэмы дзяцінства – адна са сталых традыцый у беларускай літаратуры. Заняўшы сваё адметнае месца ў творах беларускіх пісьменнікаў XX стагоддзя, гэта тэма была нязменна запатрабавана аўтарамі і служыла паказчыкам гуманістычнага характару іх творчасці. Не абмінала ўвагай гэту тэму і крытыка, даўшы ацэнку мастацкаму выяўленню тэмы дзяцінства ў творчасці Якуба Коласа, Міхася Лынькова, Янкі Брыля і іншых беларускіх пісьменнікаў. Даследавалася навукоўцамі і балючая для грамадства і для саміх аўтараў тэма апаленага вайной дзяцінства. Гэтай праблеме прысвечана праца П. Васючэнкі “Пошукі страчанага дзяцінства: беларускія празаікі «сярэдняга пакалення» аб Вялікай Айчыннай вайне” (1995).

Сярод першых твораў, прысвечаных тэме Чарнобыля, безумоўна, былі і паэмы. Падзею, што ўскалыхнула грамадства і сусвет, не мог абмінуць сваёй увагай жанр, які валодае ўнікальнымі выяўленчымі магчымасцямі і ўмее перадаваць “сутнасць чалавечага духу ва ўсіх вышэйшых нацыянальных і агульначалавечых момантах гісторыі” [1, с. 329]. Гэтыя ўласцівасці паэмнага жанру прызнаюць і маладзейшыя даследчыкі: “У сучасным літаратурным працэсе вельмі прыдатным па жанравых параметрах і досыць аператыўным для мастацкага асэнсавання складаных і драматычных перыпетый народнага быцця з’яўляецца ліра-эпас” [8, с. 36].

Сучасным пісьменнікам у значнай ступені прыдаўся вопыт творцаў, аўтараў паэм, што сталі класікай нашай літаратуры, дзе разам з многімі актуальнымі праблемамі часу знайшла сваё выяўленне і тэма дзяцінства (паэмы “Новая зямля”, “Сымон-музыка” Якуба Коласа).

У пераліку “чарнобыльскіх” паэм сёння значацца творы “Чорная быль”, “Зязюля” Сяргея Законнікава, “Зона” Уладзіміра Някляева, “Одзіум” Янкі Сіпакова, “Аварыя сумлення” Анатоля Зэкава, “Пажар слязы” Валянціны Аколавай, “Здзічэлае рэха вясны” Антаніны Хатэнкі, “Зона” Сяргея Далідовіча, “Няходжанае поле” Міколы Мятліцкага і інш. Нягледзячы на тэматычную блізкасць твораў, кожны з аўтараў імкнецца данесці да чытача сваё адмысловае бачанне і ўспрыманне праблемы, абірае адпаведныя для сваёй задумы формы мастацкага выяўлення. Ствараючы ў паэмах сваё праблемнае поле, рэдка які з пісьменнікаў не закрануў матыву дзяцінства, прысутнасць якога ў рэчышчы чарнобыльскай тэмы бачыцца цалкам апраўданым і актуальным.

Паэма “Чорная быль” С. Законнікава па праву адзначана даследчыкамі як “значны мастацкі дакумент чарнобыльскай эпохі” [4, с. 51], дзе “Чарнобыль паўстае як усенародная трагедыя, якая ўскалыхнула, зрушыла ўсё да драбніц – і быт, і непарушнасць народнага быцця, уяўлення пра свет і прыроду, і веру ў жыццё і вечнасць” [10, с. 197]. Робячы акцэнт на сацыяльна-псіхалагічных, грамадска-культурных праблемах часу, аўтар натуральна ўпісвае ў згаданы кантэкст тэму дзяцінства. Менавіта праз гэты матыў у паэме выяўляецца ўзровень парушэння чалавекам асноўных жыццёвых норм, маральных законаў.

У раздзеле паэмы “Чаравічкі” паэт узнаўляе да болю кранальную карціну, калі хлопчыкам і дзяўчынкам, вывезеным з забруджанай зоны ў санаторый пад Мінскам, прывезлі новы абутак. Дзеці не разумеюць, чаму іх прымушаюць скінуць свае чаравічкі, калі ім у іх добра і зручна. Праз сціслы эпізод аўтару ўдалося

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

перадаць багатую гаму пачуццяў, што можа ўзнікнуць у такой сітуацыі. Тут і бясконцае адчуванне віны за парушаную гармонію дзяцінства (“У пакоях ні смеху, ні песень / Моўчкі, пільна глядзяць на гасцей”), і сцішана замілаванае сцвярджэнне адвечнай беларускай сарамяжлівасці (“Перапёлачкі Беларусі, / Не саромцеся, час не такі”), і скруха за вымушаную ростань з радзімай (“Вам не бегаць па родных дарожках…”), і трывога за нявызначанасць іх будучага лёсу (“Вам з жыццём на руках, божа мілы, / У такую ісці далячынь…”).

У іншым раздзеле паэмы “Пераліванне крыві” трагедыйнасць дасягае свайго накалу: аўтар апісвае пакуты дзяцей, што сталі бязвіннымі ахвярамі тэхнагеннай катастрофы і цяпер расплочваюцца сваім здароўем за бяздумнасць і безадказнасць дарослых: “Дзеці, нібы скошаныя краскі, / Вянуць, бо бяда – бялее кроў” [9, с. 172]. Надзвычай узрушвае і расчульвае аповед пра лёс малога пацыента, які трымаецца па-даросламу, мужна (“Ён маўчыць, хоць вусны пабялелі, / Ён трывае лепей, чым стары”). Маладзенькая медсястра страчвае душэўную раўнавагу, не можа стрымаць сябе: “слязой…накіпелі вочы”.

Паводле Сяргея Законнікава, дзеці – першыя ахвяры Чарнобыля, іх смяротныя пакуты за бальнічным акном, у белых палатах – найвялікшая трагедыя Беларусі. З’яўленне ў паэме матыву нездаровага, хворага дзяцінства падкрэслівае недасканаласць свету і яго каштоўнасцей, указвае на дэфармацыю сутнасці чалавека і яго намераў. Больш таго, выяўляецца думка пра тое, што пры дапушчэнні такіх абставін з’яўляецца немагчымым і нерэальным стварэнне сапраўды гарманічнага свету. Праз названы матыў аўтар папярэджвае пра небяспеку расчалавечвання грамадства, заклікае да ачышчэння ад усяго прыкрага і ганебнага, да прасветленасці чалавечага быцця.

У іншым сваім творы, паэме “Зязюля”, С. Законнікаў працягне разгортванне матыву загубленага дзяцінства. І калі ў першым творы пісьменнік выяўляў праблему праз канкрэтна-рэалістычныя дэталі і эпізоды, то ў новым творы, згодна са сцвярджэннем навукоўцы, “пластычныя малюнкі і вобразы не адназначныя – яны набываюць сімволіка-алегарычны сэнс і дапускаюць магчымасць розных інтэрпрэтацый” [8, с. 37]. Прыдатным сродкам для такога выяўлення становяцца элементы фальклорнай паэтыкі, праз якія пісьменнік не з меншай доляй трагізму ўказвае на ступень спасцігнутай народам бяды. У разбурэнні адвечнага адзінства вобразу маці і дзіцяці, што сімвалізуюць працяг роду і жыцця ўцэлым, аўтар бачыць некаштоўнасць любых каштоўнасцей і ўяўленняў, якім б высокімі мэтамі яны не вызначаліся. Парушанасць натуральнага працэсу, калі дзіця ў мірны час адыходзіць у іншы свет раней за бацькоў, нясе ў сабе пагрозу ўсечалавечага маштабу. У аўтарскім уяўленні чалавецтва ўжо знаходзіцца на грані самазнішчэння: “…Сніцца адно і тое ж, / Назіраю, быццам з галёркі: / Зямля гайдаецца / Калыскай пустою / На цвічку самотнае зоркі” [7, с. 82].

Незалежна ад формы выяўлення, у паэмах С. Законнікава загубленае дзяцінства аднолькава асэнсавана ў маштабах усяго чалавецтва, і горка гучыць паэтава папярэджанне, што расплата за гэта будзе класціся яшчэ не на адно чалавечае пакаленне.

Натуральна, што ў паэмах пра Чарнобыль, выключна пабудаваных на трагедыйна-песімістычным пафасе, няма месца выяўленню бесклапотных і светлых праяў, тых, што класічна суправаджаюць тэму дзяцінства. Гэта даказвае яшчэ адзін знакавы твор беларускай літаратуры – паэма “Одзіум” Янкі Сіпакова. “…У паэме «Одзіум» выяўляецца трагедыйная канцэпцыя існавання жывога свету пасля

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Чарнобыля” [2, с. 22], – так вызначае галоўны ідэйны напрамак твора даследчык Л. Бараноўская. У шматзначную карціну жыцця народа паслячарнобыльскага часу аўтарам умела ўпісана тэма дзяцінства. Пагражаючы ўсяму жывому, чарнобыльская бяда замахнулася на тое, што павінна мець лагічны працяг у будучым, – на дзяцінства. І таму з асаблівым трагедыйным пафасам выяўляе Янка Сіпакоў свет дзяцінства, якое апаліў сваім чорным крылом Чарнобыль.

Як і свет дарослых, звыклы дзіцячы ўклад аказваецца да непазнавальнасці парушаны: страчаны звыклыя рэаліі, сталі несці пагрозу самыя простыя рэчы і з’явы. Усё аказваецца шкодным, небяспечным, атручаным радыяцыяй. Нават самыя смачныя рэчы, якія былі радасцю для дзяцей, нельга есці: “Дзеці спрадвек радаваліся яблыку, а зараз яго трэба / баяцца: гэты зманлівы чырванашчокі ласунак, / заўсёдная ўцеха малых, – ужо вораг дзяцей, і яго нельга есці. / І вось гэты беленькі цёпленькі, смачненькі сырадойчык, / які здавён лячыў усе хваробы, – ужо забойца для дзяцей, і яго нельга піць” [9, с. 229]. Дзеці па-свойму ўспрымаюць бяду: неяк наіўна і шчыра, але праз такое ўспрыманне найбольш падкрэсліваецца безабароннасць дзіцячага свету перад сур’ёзнай небяспекай. “Усё лета я хаваўся ад радыяцыі,” – хваліцца хлопчык з той страшнай зоны, бо пакуль што не ведае, што схавацца ад той радыяцыі нельга” [9, с. 230]. Не ў меншай меры кранае боль і тых дзяцей, што ў раннім узросце разумеюць сваю вырачанасць, адчуваюць усю безвыходнасць свайго становішча: “Доктар сказаў, што ў мяне дужа многа радыяцыі,” – сумуе дзяўчынка з той жа самай зоны, бо ўжо ведае: тое, што з ёй, з ёй назаўсёды – радыяцыя не прастуда, яна не выводзіцца” [9, с. 230].

У паэме згадкі пра балючыя факты дэфармацыі дзіцячага свету і ўяўленняў цесна звязаны з агульным станам, з жыццём усяго народа. Як і дарослыя, дзеці спажываюць атрутныя прадукты, ходзяць на дэманстрацыі і жывуць на забруджанай радыяцыяй тэрыторыі. І дзяцінства ў такім выпадку, трапляючы ў большай ступені пад разбуральную сілу абставін, набывае напружаны эстэтычны сэнс, бо так выяўляецца ў найбольш непрыгляднай форме абясцэненасць асноў быцця чалавека і свету. Так матыў дзяцінства дапамагае ўбачыць і выявіць такія глыбінныя працэсы, якія магчыма разгледзець толькі пры ўніклівым і непасрэдным успрыманні свету.

Некалі даследчык П. Васючэнка канстатаваў: “Там, дзе распавядаецца пра дзяцінства, апалёнае вайной, – узнікае квант узмоцненай эмацыйнай і мысліцельнай энергіі. Паказ дзяцінства ўскладняе і без таго складаны комплекс этычных пытанняў…” [5, с. 66]. Не ў меншай меры сцвярджэнне дастасоўваецца да іншай, але ў нечым падобнай сітуацыі – да паказу загубленага Чарнобылем дзяцінства.

Разгледзеўшы найбольш значныя творы беларускіх пісьменнікаў паэмнага жанру, можна канстатаваць, што пры наяўнасці розных падыходаў у выяўленні тэмы дзяцінства ў аўтараў ёсць шмат агульнага: трагедыйнасць гучання, адчуванне неабсяжных маштабаў катастрофы, якая пагражае чалавецтву, што занядбала адвечныя законы існавання. І хаця матыў дзяцінства ў паэмах не з’яўляецца дамінуючай праблемай, ён з’яўляецца важнай і арганічнай часткай таго свету, які выяўляе аўтар і які спрабуе асэнсаваць. Прысутнасць названага матыву не ў меншай меры дае магчымасць зразумець і ацаніць аўтарскія адносіны да свету, да паняццяў дабра і чалавекалюбства.

Літаратура

1. Арочка, М. Беларуская савецкая паэма / М. Арочка. – Мінск, 1979. – 336 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Бараноўская, Л. Сэнсавая аб'ёмнасць паэмы "Одзіум" Я. Сіпакова /Л. Бараноўская // Роднае слова. – 2003. – № 12. – С. 21–22.
3. Бельскі, А. Бядой запаленае слова: Чарнобыль у беларускай паэзіі / А. Бельскі // Краса і смутак : дапаможнік для настаўнікаў / А. Бельскі. – Мінск, 2000. – С. 112–120.
4. Бельскі, А. С. Законнікаў да і пасля Чарнобыля / А. Бельскі // Роднае слова. – 2004. – № 3. – С. 50–53.
5. Васючэнка, П. В. Пошукі страчанага дзяцінства: беларускія празаікі «сярэдняга пакалення» аб Вялікай Айчыннай вайне / П. В. Васючэнка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – 80 с.
6. Законнікаў, С. Чорная быль. / С. Законнікаў // Зорка Палын : творы беларускіх паэтаў пра чарнобыльскую трагедыю ; уклад. А. І. Бельскага ; прадм. С. С. Шушкевіча. – Мінск, 1993. – С.168–199.
7. Законнікаў, С. Дол : вершы і паэмы / С. Законнікаў. – Мінск : Галіяфы, 2008. – 496 с.
8. Заяц, Н. Мастацкае асэнсаванне чарнобыльскай трагедыі ў сучасным ліра-эпасе / Н. Заяц // Веснік БДУ. Серыя 4. – 2009. – №1. – С. 36–39.
9. Зорка Палын : творы беларускіх паэтаў пра чарнобыльскую трагедыю ; уклад. А. І. Бельскага ; прадм. С. С. Шушкевіча. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 255 с.
10. Чабан, Т. Мара пра эпас / Т. Чабан // Полымя. – 1990. – № 4. – С. 194–200.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ